**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна**
**за кастрычнік 2019 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка міласэрнасці

**1 кастрычніка**

На пасяджэнні клуба «Залатыя гады» «Вяршыня мудрасці пражытых гадоў», прысвечаным Дню пажылых людзей, гучалі віншаванні са святам ад кіраўніка клуба Юліі Пракапук. Перад прысутнымі выступілі вакальны гурт бібліятэкараў «Фантазія» і член літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Зінаіда Навасад. Самадзейны тэатр-студыя «Піражок» паставіў сцэнку «Ля варот рая». Фінальным акордам свята стала чаяванне.

**ЦБ, 40 чал.**

**2 кастрычніка**

У святочнай праграме «Ад вас бярэм успаміны, а сэрца пакідаем вам», праведзенай да Дня пажылых людзей, прысутныя ўдзельнічалі ў конкурсе «Успомнім любімую песню», у віктарыне «Адгадай загадку і вазьмі прыз». Да свята афармлена выстава «Ёсць у любым узросце добрае заўсёды».

**Дзівінскі ф-л, 75 чал.**

ЛПГ «Крыніца» правёў святочную праграму «Галава сівая, ды душа маладая». Да мерапрыемства падрыхтаваны кніжная выстава «У гармоніі з узростам» і выстава работ Аляксандры Альшэўскай «Я на пенсіі сяджу, час дарэмна не праводжу». Віншаванні з Днём пажылых людзей гучалі ад старшыні сельвыканкама Валянціна Скакуна, дырэктара ААТ «Навасёлкаўскі» Аляксандра Мельнікава і старшыні савета ветэранаў Таццяны Буйніч. Гучалі песні ў выкананні вакальнага гурта ДК, дзеці чыталі вершы, загадвалі загадкі дзядулям і бабулям. Вядучыя правялі конкурсы і віктарыны. У завяршэнні свята кожны атрымаў тэлефонны даведнік, падрыхтаваны бібліятэкарам.

**Навасёлкаўская ПБ, 100 чал.**

## Мерапрыемствы да Дня маці

**10 кастрычніка**

У бібліятэцы адбылося свята «Тепло сердец для наших мам». Мерапрыемства прайшло ў форме інфармацыйнага канала з перадачамі «Пока все дома», «Устами младенца», «Угадай мелодию», «Минута славы», «Танцы со звёздами». Святочны канал упрыгожылі музычныя паўзы, гульні і конкурсы. Прысутныя склалі слоўнік чароўных слоў «Моя мама – самая…». Яшчэ адным сюрпрызам для матуль і бабуль сталі падарункі, якія дзеці зрабілі сваімі рукамі.

**Арэхаўская ПБ, 30 чал.**

**13 кастрычніка**

У бібліятэцы прайшоў бібліятэчны журфікс «Мы ўсе жывем пад зоркамі матуль». Прысутныя прымалі віншаванні за кубачкам гарбаты. Сваімі вершамі пра мам падзяліліся член Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў, член літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Кобрынскай цэнтральнай раённай

бібліятэкі Надзея Момлік і паэт-аматар Ірына Жук. Новае апавяданне прачытала Надзея Самасюк. Бібліятэкары правялі агляд кніжнай выставы «Душы тваёй святло мяне абараняе» і паказалі відэапрэзентацыю «Спасибо тебе за любовь сквозь года».

**Дзівінскі ф-л, 27 чал.**

На літаратурна-музычным свяце «Самая лучшая мама земли, самая лучшая мама на свете» з вершамі і песнямі выступілі члены народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел», клуб аматараў фальклору «Магдаліна», акампаніятар Магдалінскага ДК Аляксей Кірыеўскі. Песні для мам спявалі дзеці.

**Магдалінская ПБ, 50 чал.**

**18 кастрычніка**

На вечары-прызнанні «Все краски жизни для тебя» прысутнічалі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Гасцямі сустрэчы сталі акушэр-гінеколаг філіяла Кобрынскай ЦРБ «Радзільны дом» Вадзім Мех, урач-валеолаг Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева і супрацоўніца дзіцячага філіяла бібліятэкі, мама траіх дзяцей Галіна Блінкоўская.

**ЦБ, 65 чал.**

## Да 205-годдзя Міхаіла Лермантава

**17 кастрычніка**

Падчас бенефісу «Былого незабвенные страницы» бібліятэкар правяла агляд кніжнай выставы-партрэта «Великий классик русской поэзии». Прысутныя ўдзельнічалі ў літаратурнай гульні «Лермонтов знакомый и незнакомый», а ў літаратурнай дуэлі «Лермонтовские строки» перамог вучань 10 класа Віталій Вашчук.

**Верхалеская ПБ, 18 чал.**

**20 кастрычніка**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прысвяцілі 205-годдзю Міхаіла Лермантава. Бюро творчых знаходак «Учимся у Лермонтова» працавала ў інфармацыйна-сервісным цэнтры бібліятэкі. Кобрынскія паэты вывучалі літаратурныя прыёмы класіка рускай літаратуры і вучыліся ўжываць іх у сваёй творчасці.

**ЦБ, 7 чал.**

## Іншыя мерапрыемствы

**11 кастрычніка**

У бібліятэцы прайшоў семінар-практыкум для бібліятэкараў раёна «Поставить всех в известность о себе». Галоўным стала пытанне сучасных патрабаванняў да размяшчэння інфармацыі на інфармацыйных стэндах і ў папках сацыяльна-бытавой інфармацыі. Узнагароджаны пераможцы раённага конкурсу на лепшую работу з дзецьмі і падлеткамі «Каникулы в библиотеке». Падарункам бібліятэкарам да Дня работнікаў культуры стаў спектакль «Вся власть пенсионерам!» самадзейнага тэатра-студыі «Пирожок», які працуе на базе Кобрынскай цэтральнай раённай бібліятэкі.

**ЦБ, 55 чал.**